# ПРА БРАТОЎ КОСМАЧАЎ, ВЁСКУ ТАЛУІ І НАШЫХ НАСТАЎНІКАЎ

***У.Е. Снапкоўскі,*** *г. Мінск (Рэспублика Беларусь)*

У артыкуле аўтар дзеліцца сваімі ўспамінамі аб братах Генадзе і Веніяміне Космачах, знаёмстве з імі , сяброўстве і сумесным навучанні з Генам на гістарычным факультэце БДУ (1971–1976). Апісваецца шлях у навуку, выбар тэматыкі даследаванняў і навуковых кіраўнікоў. Характарызуюцца вехі навуковай біяграфіі Г.А. і В.А.Космачаў, іх дасягненні ў галіне германістыкі. Адзначаецца вельмі важны і цікавы паварот В.Космача да тэматыкі рэгіянальнай гістрыі і краязнаўства, што адлюстравана ў яго манаграфіі пра родную вёску Талуі Маладзечанскага раёна Мінскай вобласці. Даюцца характарыстыкі любімых універсітэцкіх выкладчыкаў, якія аказалі глыбокі ўплыў на далейшы лёс братоў Космачаў і аўтара, у выніку чаго ўсе ўтраіх пазней сталі прафесарамі.

**Ключавыя словы:** біяграфіі гісторыкаў; аўтабіяграфія; гістарычны факультэт БДУ; беларуская гістарыяграфія.

З Генам Космачам я пазнаёміўся і потым блізка сыйшоўся на першым курсе гістарычнага факультэта БДУ, куды паступіў у 1971 г. Мы апынуліся ў адной групе, дзе Гена стаў выдзяляцца добрымі адказамі на семінарскіх званятках. У кабінеце Гісторыі КПСС (на пятым паверсе галоўнага корпуса БДУ) я часта заўважаў постаць схіленага над кнігамі майго аднагрупніка, які старанна канспекціраваў працы класікаў марксізма-ленінізма. Тым жа самым займаўся і я. Сталі вывучаць К. Маркса, Ф. Энгельса і У.І. Леніна разам.

З трэццяга курса мы з Генам сталі жыць у адным утульным пакоі на другім паверсе (комната № 49) у інтэрнаце на вул. Свярдлова, 34, дзе нас было пяць чалавек (Гена Космач, Толя Шутко, Вася Асіпёнак, Віця Цярэшка і я). Я быў самы малодшы, паступіўшы ва ўніверсітэт адразу пасля школы. Гена выдзяляўся мэтанакіраванасцю і цвёрдасцю характара. Быў старэйшы за мяне на год, паступіўшы ў БДУ з другога захода. Пасля няўдачы з першым паступленнем на філасофскае аддзяленне гістфаку БДУ працаваў у роднай школе, добра падрыхтаваўся да ўступных экзаменаў і іх паспяхова здаў. За вучобу Гена ўзяўся без раскачкі, вучыўся выдатна і атрымаў чырвоны дыплом. Я цягнуся за ім, але два першых курса быў “харашыстам”, атрымліваючы чацвёркі і пяцеркі. На 3-м курсе дзякуючы рэгулярнай працы з вучэбнай і навуковай літаратурай мы з Генам ужо шмат што ведалі, калі можна так сказаць пра неабсяжны працэс пазнання, і выдзяляліся сярод іншых студэнтаў. Мае адзнакі пайшлі ўверх і я стаў амаль што выдатнікам, хаця чырвонага дыплома не атрымаў.

У працэсе навучання і авалодвання гістарычнымі ведамі мы з Генам ішлі featureнымі шляхамі, дапаўняючы адзін аднаго. Ён з уласцівай яму сялянскай практычнасцю і прагматызмам мэтанакіравана ішоў ўглыб, што праяўлялася ў глыбокім веданні нямецкай мовы на перакладчыцкім узроўні і грунтоўнай даследчыцкай распрацоўцы тэмы дыпломнай працы на падставе нямецкамоўнай літаратуры і дакументаў. На 4–5-х курсах ён

ужо працаваў з літаратурай спецфондаў бібліятэкі БДУ і Дзяржаўнай бібліятэкі БССР і пазнаёміў мяне з загадчыцай чытальнай залы Ленінкі, куды я канечне доступу не меў, але зазірнуць на паліцы схаваных у спецхране кніг было вельмі цікава. Гена меў акрэсленую мэту стаць вучоным, хаця мне аб гэтым не казаў, і ўпэўнена ішоў па выбранаму шляху.

Я такой мэты ў студэнцкія гады не меў і не думаў неяк сур'ёзна над сваёй будучыняй. Захапляўся навейшай гісторыяй, філасофіяй, мастацкай гістарычнай прозай, прыгожым пісьменствам. Чытаў шмат, але больш несістэмна. Калі Гена ішоў углыб, то я пашыраў свае веды з розных гуманітарных дысцыплін. Магчыма, гэта не было апраўдана і шмат часу было згублена напэўна дарэмна, аднак і тады, і ў будучым выпрацаваны шырокі погляд на гуманітарыстыку, любоў хадзіць паміж бібліятэчных паліц, гартаць кнігі і чытаць энцыклапедыі дапамагалі хутка арыентавацца ў акіяне навуковай літаратуры [9, с. 347].

Пасля заканчэння ўніверсітэта Гену пакінулі ў БДУ, я паехаў па размеркаванні ў вёску Пальмінка Гарадоцкага раёна Віцебскай вобласці ў сярэднюю школу настаўнікам гісторыі і грамадазнаўства. Аднак родная кафедра новай і навейшай гісторыі дала мне рэкамендацыю ў аспірантуру, якую здавалася немагчыма было выкарыстаць, паколькі трэба быдо адпрацаваць два гады па размеркаванні. Дзякуючы шчасліваму збегу абставін, выдатным адзнакам пры паступленні ў аспірантуру Інстытута гісторыі АН БССР і дапамозе добрых людзей (загадчыка сектара гісторыі еўрапейскіх сацыялістычных краін Васіля Сямёнавіча Талстога і навуковай супрацоўніцы сектара Марыі Георгіеўны Крэканэ), пра што я заўсёды памятую, у лістападзе 1976 г. я быў залічаны ў аспірантуру. Пачаўся новы, пасля-ўніверсітэцкі перыяд маіх адносін з Генам Космачам.

Вольны час мы праводзілі не толькі ў працы з кнігамі і канспектамі. Утраіх разм з Генам і Толям Шутко любілі хадзіць у Купалаўскі тэатр, дзе пераглядзілі амаль увесь рэпертуар, наведвалі часам Рускі тэатр і кіно, хадзілі парыцца ў лазню на Мар'еўскай. З Лёням Жыхарам я часам хадзіў на футбол на "Дынама", якое было побач, ці глядзеў спартыўныя перадачы па тэлевізары. Утраіх хадзілі на танцы, што праходзілі як у галоўным корпусе, так і ў нашым інтэрнаце. На 5-м курсе падчас адной з такіх вечарынак Толя пазнаёміў нас са студэнткай 3-га курса Тамарай Скачко, вясёлай і адкрытай дзяўчынкай, якая запала ў душу Геню. Яны пачалі сустракацца і паміж імі ўзнікла трывалыя адносіны, пра што аднак я ўзнаў пазней. Яны хутка ажаніліся, але гэты першы шлюб Гены аказаўся недаўгавечным. Пра Тамару хацеў бы тут сказаць асобна, ніякім чынам не закранаючы маёй светлай памяці пра Гену. Яна адыграла выключна важную ролю і ў маім жыцці, калі пазнаёміла мяне ўвёсну 1980 г. з маёй будучай жонкай Святланай, з якой яна разам працавала ў Мінскім медыцынскім вучылішчы. Мы з удзячнасцю запрасілі яе на сваё вяселле ў кастрычніку таго ж года. Са Святланай мы жывем у шчаслівым шлюбе маючы двух сыноў. На жаль пра далейшы лёс Тамары мне невядома.

На старэйшых курсах Гена пазнаёміў мяне са сваім малодшым братам Веняй, які таксама палюбіў гісторыю і цягнуўся да навукі. Знаёмства адбылося ля будынку Дзяржаўнай бібліятэкі, потым разам з Генам мы пайшлі ў чытальную залу, а Веня, як памятую, накіраваўся ў абласную бібліятэку імя А.Пушкіна. Ён таксама выдатна вучыўся ў школе, дасканаліў веданне нямецкай мовай і рыхтаваўся ісці па слядах старшага брата ў даследаванні навейшай германскай гісторыі. Ён паступіў на гістарычны факультэт БДУ ў 1977 г., пад кіраўніцтвам праф. Г.Трухнова стаў вывучаць савецка-германскія адносіы і знешнюю культурную палітыку веймарскай Германіі, па якіх напісаў выдатную дыпломную працу, а потым абараніў кандыдацкую і доктарскую дысертацыі. Веня аказаўся і маім студэнтам, калі я пачаў ў 1980/81 навучальным годзе выкладчыцкую працу па кафедры новай і навейшай гісторыі. Сярод іншых студэнтаў памятую Віктара Шадурскага, з якім пазней працаваў на факультэце міжнародных адносін БДУ, цяперашніх выкладчыкаў гістарычнага факультэта --Сяргея Ходзіна, Алега Пэрзашкевіча, Міхаіла Даўгялу, Тадэвуша Навагродскага і некаторых іншых.

Пасля заканчэння БДУ Веня апрацаваў тры гады сельскім настаўнікам у школе, завочна закончыў аспірантуру і абараніў кандыдацкую дысертацыю, ажаніўся са сваёй аднакурсніцай і пераехаў працаваць у яе і мой родны горад Віцебск. У Віцебскім медыцынскім інстытуце (пазней універсітэце) стаў расцвітаць яго талент вучонага і выкладчыка. Працягваў займацца даследаваннем знешняй палітыкі Германіі ў міжваенныя часы, скончыўшы завочна дактарантуру пры Інстытуце ўсеагульнай гісторыі АН СССР (цяпер РАН), дзе ў 1995 г. абараніў доктарскую дысертацыю. Прыходзіў і да нашай кафедры міжнародных адносін БДУ, дзе мы дапамагалі добрымі водгукамі і кансультацыямі.

Шлях у вышэйшую школу да вяршын гістарычнай адукацыі, а потым у навуку да атрымання найвышэйшых ступенняў і званняў дактароў гістарычных навукі прафесараў для Генадзя і Веніаміна Космачаў быў у значнай меры падобны і адбываўся на маіх вачах. Гэта выдатная вучоба ва ўніверсітэце і спецыялізацыя па кафедры новай і навейшай гісторыі пад кіраўніцтвам праф. Г.М.Трухнова. Потым аспірантура пры БДУ і паспяховая абарона кандыдацкай дысертацыі па навейшай гісторыі Аўстрыі (у Гені) і Германіі (у Вені) пад кіраўніцтвам Г.М.Трухнова. Наступны крок па падрыхтоўцы доктарскіх дысертацый ужо давялося рабіць у дактарантуры ў Маскве пры Інстытуце ўсеагульнай гісторыі АН СССР, дзе была мацнейшая ў саюзе школа германістаў. Гена абараніў доктарскую працу ў 1990 г., праз пяць год гэта зрабіў малодшы брат.

Пры сустрэчах з Генам мы абменьваліся сваімі пошукамі, знаходкамі і дасягненнямі. Мая кандыдацкая дысертацыя была прысвечана таксама германскай тэматыцы, але ўжо пасляваеннай і амаль што сучаснай: адносінам паміж ГДР і ФРГ ў 1970-я гады. Аспірантуру я праходзіў у Інстытуце гісторыі АН БССР, а навуковым кіраўніком мне прызначылі вядомага савецкага германіста, выхадца з Беларусі (з-пад Оршы), прафесара Акадэміі грамадскіх навук пры ЦК КПСС В.Ц.Фаміна. Дактароў навук па сучаснай германскай

гісторыі ў Беларусі не было і загадчык сектара В.Талстой, маючы ранейшыя сувязі з вядомым земляком у Маскве, прапанаваў яму аспіранта. І гэта адбылося, як памятую, пасля абароны ў спецсавеце БДУ доктарскай дысертацыі Д.С.Клімоўскага, дзе В.Фамін выступаў афіцыйным апанентам. У 1977 г. упершыню паехаў у камандзіроўку ў Маскву, дзе пазнаёміўся з навуковым кіраўнікам. Тады ж абралі і тэму кандыдацкай дысертацыі.

Яна была "навеяна" несумненным уплывам на мяне яшчэ адной неардынарнай асобы з ліку супрацоўнікаў кафедры новай і навейшай гісторыі – дацэнта, кандыдата гістарычных навук М.Г. Елісеева. Ён прачытаў на 4-м курсе спецкурс па адносінах паміж двума германскімі дзяржавамі, а ў 1975 г. выдаў манаграфію "Бонн и ГДР". У наступныя гады Міхаіл Герасімавіч працягваў даследаванне гэтай тэмы, павярнуўшы яе да адлюстравання пазіцыі Свабоднай дэмакратычнай партыі ФРГ да ўсходняй палітыкі і асабліва да ГДР. У 1989 г. ён выдаў капітальную кнігу, якая цалкам адпавядала самым высокім стандартам доктарскай дысертацыі. Аднак спыненне існавання ГДР і яе далучэнне да Заходняй Германіі, а потым распад СССР кардынальна змянілі гістарычныя і палітыка-ідэалагічныя арыенціры і падыходы. М.Елісееў быў вымушаны адмовіцца ад планаў абароны доктарскай дысертацыі па абранай раней тэме. Хаця я лічу, што ён мог бы павярнуць тэму ў новым ключы. У тым жа 1989 г. манаграфію пра крах германскага лібералізму ў 1920-пачатку 30-х гг. апублікаваў Г.Космач. На кнігі М.Елісеева і Г.Космача я адрэагаваў рэцэнзіяй пра сутнасць і асаблівасці германскага лібералізму ў даваенныя і пасляваенныя часы, дзе сказаў добрыя і адпаведныя зместу гэтых прац словы ў адрас сябра і настаўніка [10].

Нашы (братоў Космачаў і мае) паездкі ў Маскву былі абумоўлены наяўнасцю там навуковага кіраўніка (для мяне) і пазней навуковых кансультантаў для ўсіх нас траіх па доктарскіх дысертацыях, існаваннем у сталіцы моцных навуковых цэнтраў і канешне канцэнтрацыяй у маскоўскіх бібліятэках гістарычных крыніц і навуковай літаратуры. Але трэба адзначыць, што па міжваеннай германскай гісторыі і па міжнародных адносінах у Еўропе ў пасляваенны перыяд нядрэнная падборка замежнай, асабліва нямецкамоўнай літаратуры была ў Мінску ў Дзяржаўнай (зараз Нацыянальнай бібліятэцы) і Бібліятэцы Акадэміі навук. Я гэтымі крыніцамі актыўна карыстаўся. Добра працаваў тады міжбібліятэчны абанемент, дзякуючы якому атрымліваў кнігі з Масквы, ГДР і нават з ФРГ. Гена трапіў у савецкія архівы і паказаў нам з Веняй туды дарогу. Так для мяне былі адкрыты Архіў знешняй палітыкі СССР і Цэнтральны ваенны гістарычны архіў. Пазней у 1990-я і пачату 2000-х гг. да іх далучыліся іншыя расійскія архівы.

Веня успамінае: "Мы с Геннадием часто бывали в Москве, работали там в архивах, днями пропадали в "историчке" –Государственой публичной исторической библиотеке. Недалеко от Старой площади и Кремля. Перечитали и законспектировали огромное количество документального материала, Ну, и конечно же, незабываемые встречи с коллегами-

историками в Москве, а также на многочисленных научных конференциях по всему СССР, после 1991 г. –по всей России" [1, с. 206].

Пасля дасягнення вяршын навукі, атрымання высокіх ступеняў і званняў, універсітэцкіх пасад (Гена больш за 20 гадоў загадваў кафедрай у БДПУ імя М.Танка, Веня працяглы час быў дэканам і загадчыкам кафедры ў Віцебскім дзяржаўным універсітэце), публікацыі манаграфій і падручнікаў надыйшоў час вяртання да малай Радзімы. Па словах Вені, Гена даўно яго падштурхоўваў да напісання гісторыі іх роднай вёскі Талуі, рода Космачаў і іх сям'і. Праца пачалася ў Маскве ў Дзяржаўнай гістарычнай бібліятэцы. У перапынках паміж вывучэннем пратаколаў германскага рэйхстага з цяжкім гатычным шрыфтам Веня стаў чытаць для разрадкі літаратуру пра гісторыю роднага краю –Віленскай губерні, Ашмянскага, Маладзечненскага, Вілейскага і іншых паветаў, Маркаўскага сельскага савета і непасрэдна роднай вёскі Талуі, якой у 2016 г. споўнілася 400 год.

Калі меркаваць па той капітальнай працы, якую выдаў В. Космач у 2022 г., яе аўтар прааналізаваў шмат разнастайных гістарычных крыніц і навуковай, даведачна-энцыклапедычнай літаратуры. А межы даследавання ахопліваюць XVII – пачатак XXI ст. Сярод крыніц вядзяляюцца статыстычныя матэрыялы часоў Расійскай імперыі і СССР, дакументы Нацыянальнага гістарычнага архіва Беларусі, кнігі з серыі "Памяць", даведнікі і энцыклапедыі, гістарычныя даследаванні, інтэрнет-крыніцы. У кнізе шмат архіўных дакументаў, картаграфічных матэрыядаў. успамінаў, фотаздымкаў. У 11 главах апісваецца гісторыя вёскі Талуі, а таксама Маркава і навакольных вёсак і пасяленняў, паходжанне фаміліі Космачаў і лёс яе носьбітаў. Асобная ўвага надазена бацькам, бацькоўскаму дому і блізкім сваякам. Сваім бацькам -Ніне Рыгораўне і Аркадзю Сцяпанавічу і брату Генадзю аўтар пасвяціў сваю кнігу. У апошняй главе "З сямейнага архіва" змешчаны фотаздымкі, дзе я знайшоў і памятныя і на жаль рэдкія для мяне і нас адбіткі са студэнцкага жыцця ў Мінску [1]. Іх малавата, Гена не вельмі любіў фатаграфавацца, лічыў гэта непатрэбнай рэччу, таму выпускнога здымку ў нас няма.

Прэзентацыя кнігі з удзелам аўтара адбылася ў Маркаўскім сельскім Доме культуры ў кастрычніку 2022 г. Вядомага беларускага гісторыка і свайго земляка цёпла віталі мясцовыя жыхары, краезнаўцы-даўнія сябры і кіраўніцтва сельсавета. У адказ на прапановы В.Космач паабяцаў пашырыць выданне і падрыхтаваць новую кнігу пра Маркава, вёску са статусам аграгарадка, вядомую з XIУ ст. як валоданне караля і вялікага князя Казіміра IУ [2 ]. Вёска Талуі вядома дзякуючы старажытнаму вязу-старажылу, якому больш за два стагоддзі і з якога ў добрае надвор'е бачна тры гарады: Вілейку, Маладзечна і Смаргонь [3]. Пра гэты вяз мне казаў і студэнцкі сябар Лёня Жыхар, ураджэнец Мядзельшчыны. Талуёўскаму вязу і Талуям В. Космач прысвяціў заключныя радкі сваёй кнігі: "Часоў мінула шмат у вёсцы../А ён яднае ўсіх нас/Павагай да бацькоў і продкаў/-Славуты Талуёўскі вяз!" [1, с. 338].

У жніўні 2022 г. у Віцебску Веня падарыў мне кнігу з цёплым надпісам у мой і жонкі Святланы адрас. Я з задавальненнем прыняў падарунак,

адзначыўшы, што Веня зрабіў вельмі важную справу як прафісійны гісторык і патрыёт. Пасля даследавання замежных дзяржаў і народаў надыйшла чарга аддаць даніну сваёй малай Радзіме, вёсцы, раёну, гораду, рэгіёну, увесці ў гістарычны дыскурс сваіх продкаў, сям'ю і блізкіх. Калі гэта робіць майстар сваёй справы, доктар гістарычных навук і прафесар, атрымліваецца прафісійная сага з жанру рэгіяналістыкі, краіназнаўства і сямейнай гісторыі. Нешта падобнае стварыў у 1989 г. вядомы беларускі і, па волі лёсу, расійскі гісторык Мікалай Улашчык сваёй кнігай "Была такая вёска" пра родную вёску Віцкаўшчыну (цяпер Дзяржынскі раён Мінскай вобласці) [12]. На прыкладзе яе жыхароў ён у гэтай кнізе і ранейшых публікацыях абвергнуў міф ці паўміф аб непісьменным і цёмным беларускім народзе, які знаходзіўся ў такім стане перад Кастрычніцкай рэвалюцыяй, што актыўна выкарыстоўвала савецкая гістарыяграфія [13]. У 1990-я гады гэта ненавуковае сцвярджэнне на падставе новых і раней вядомых гістарычных фактаў было адкінута беларускімі даследчыкамі па гісторыі адукацыі і педагагічнай думкі (С.В.Снапкоўская) [4, с. 12, 17, 25-26; 5, с. 122-126] і прынята сучаснай замежнай гістарыяграфіяй, у тым ліку польскай [ 6, с. 36-38].

В.Космач у кнізе пра Талуі не дае дадзеных пра ўзровень пісьменнасці мясцовых жыхароў у часы Расійскай імперы і СССР, паколькі гэта не ўваходзіла ў даследчыя задачы. Аднак у статыстыцы і навуковай літаратуры гэта ўжо вядомыя лічбы на ўзроўні паветаў і губерняў. Па перапісе 1897 г. самы высокі ўзровень пісьменнасці ў Паўночна-Заходнім краі (беларукія паветы) мелі заходнія губерні Беларусі, сярод якіх на першым месцы ішла як раз Віленская губерня з паказчыкам 33,9%, апераджваючы сярэдні паказчык у 25,7%. На апошні месцы ішла Магілёская губерня –21,8% [7, с. 36].

Сваёй кнігай пра Талуі і навакольныя вёскі В.Космач зрабіў важны паварот у даследчым полі, перайшоўшы ад усеагульнай да айчыннай, нацыянальнай гісторыі, ад палітычнай гістарыяграфіі замежных дзяржаў (германістыкі) да краязнаўства, ад высокай, класічнай гісторыі да родных каранёў. Паварот у пэўнай ступені лагічны, выкліканы прафісійнай эвалюцыяй высокакваліфікаванага гісторыка і развіццём гістарычнай, нацыянальнай і грамадскай свядомасці грамадзяніна.

Пра Талуі ўпершыню пачуў ад Гены, які кожныя выходныя наведваў бацькоў у вёсцы. З дому ён прывозіў смачныя мясныя і малочныя вырабы, якімі нас частаваў. Гэта было сала, сальцісон, розныя вяндліны, сыр, тварог. Гена дапамагаў бацькам, у вёсцы набіраўся сіл і энергіі. Я с жонкай Святланай упершыню і ў апошні раз наведаў Талуі ў 1981 г., калі Гена запрасіў нас на сваё вяселле. Тады пазнаёміўся з бацькамі майго сябра, убачыў яго любімага настаўніка гісторыі, пра якога Гена часта ўспамінаў.

Некалькі слоў пра нашых універсітэцкіх настаўнікаў, пра што ўжо ранй пісаў. Любоў да гісторыі прыйшла на трэцім курсе, калі лекцыі сталі чытаць выкладчыкі кафедры новай і навейшай гісторыі, па якой мы з Генам сталі спецыялізавацца. З задавальненнем канспекціраваў лекцыі па першаму перыяду новай гісторыі краін Еўропы і Амерыкі маладога выкладчыка, кандыдата гістарычных навук В.І.Сініцы, які стаў маім

навуковым кіраўнікам па курсавых і дыпломнай працах. Некаторыя яркія гістарычныя факты з яго лекцый мне вельмі дапамагалі ў працы з аўдыторыяй, у тым ліку з нямецкімі студэнтамі, калі стаў выкладчыкам. На 3-м курсе Вадзім Іванавіч прывёў мяне ў навуковую залю Дзяржаўнай бібліятэкі, дзе я пазнаёміўся са службовым каталогам бібліятэкі і мог заказваць у агульнай чытальнай залі дарэвалюцыйную літаратуру, патрэбную для дыпломнай працы. Бібліятэкі я палюбіў са школьных гадоў і калі хадзіў у бібліятэку Чыгуначнага раёна Віцебска, набіраў шмат кніжак на абанеменце, якія даваў чытаць вулічным сябрам і прыяцелям. Потым адкрыў абласную бібліятэку, куды хадзіў у чытальную залу, прыязджаючы на канікулы да бацькоў і пазней пасля ўніверсітэта. Генеральны службовы каталог Дзяржаўнай бібліятэкі адкрыў дзверы ў неабсяжны свет ведаў. Пасля знаёмства з ім быў вельмі ўзрушаны і доўга не мог заснуць у нашым інтэрнацкім пакоі. Зараз, калі праязджаю міма на машыне па крутым спуску па вуліцы Кірава з працы дамоў, успамінаю як В.І.Сініца адкрыў мне дзверы ў край навукі і ведаў.

Але сапраўднае захапленне адчуў ад лекцый загадчыка кафедры, прафесара Льва Міхайлавіча Шнеерсона, прысвечаных другому перыяду новай гісторыі краін Еўропы і Амерыкі. Пра гэта я напісаў у артыкуле аб лектарскім майстэрстве Л.М.Шнеерсона, гэтага выдатнага выкладчыка, вучонага і вельмі прыемнага чалавека, якога лічу сваім настаўнікам. Яго канспект лекцый, дзе ўсё запісана амаль слова ў слова, захоўваецца ў мяне па сённяшні дзень [8]. Мае пачуцці наконт выкладчыкаў падзяляў і Гена, які выбраў сябе навуковым кіраўнікам прафесара Р. М. Трухнова.

На 4-м курсе да плеяды любімых выкладчыкаў далучыліся дацэнты кафедры новай і навейшай гісторыі Міхаіл Герасімавіч Елісееў і Данііл Сяргеевіч Клімоўскі. М.Елісееў прыцягваў да сябе моцнай энергетыкай, аратарскім майстэрствам, камунікабельнасцю і ўменнем працаваць са студэнтамі. Пасля 3-га курса Гена ў складзе групы студэнтаў, якую ўзначальваў М. Елісееў, ездзіў у ГДР, дзе пазнаёміўся з універсітэцкім жыццём і ўдасканаліў веды нямецкай мовы. Як ужо адзначаў, Міхаіл Герасімавіч займаўся адносінамі паміж дзвюма германскімі дзяржавамі і дзякуючы напэўна гэтаму я выбраў падобную тэматыку. Ён быў строгім і патрабавальным выкладчыкам, але Генам і мной апекаваўся як здольнымі студэнтамі і цікавіўся нашымі справамі, па неабходнасці дапамагаў. Пазней, пасля заканчэння ўніверсітэта ў мяне з ім склаліся добрыя, прыязныя адносіны, якія працягваліся аж да яго заўчаснага зыходу з жыцця ў 1997 г. [11].

Прафесар Р.М.Трухноў таксама быў неардынарнай асобай сярод выкладчыкаў кафедры і ўсяго гістарычнага факультэта, прыцягваючы да сябе адкрытасцю і ўласцівымі яму паводзінамі, асабліва абаронай сваіх пітомцаў, што пісалі пад яго кіраўніцтвам дыпломныя працы і дысертацыі. Памятаю, як на гэтай глебе загадчык кафедры Л. Шнеерсон стрымліваў і супакоіваў свайго сябра-калегу Р.Трухнова, які даволі рэзка выказаўся ў адрас сваіх вучняў Л.В.Лойкі і П.А.Шупляка за тое, што тыя, на яго думку, занадта крытычна выказваліся на адрас кандыдацкай дысертацыі яго аспіранткі, дарэчы жонкі

Геннадзя. У гэтым сэнсе Гена мог адчуваць сябе як за камяннай сцяной. Не ведаю, як Гена сышоўся з прафесарам, але тэму дыпломнай працы Рыгор Маркавіч яму выбраў з перспектывай, якая потым перарасла ў кандыдацкую дысертацыю пад яго ж кіраўніцтвам. На 4-м курсе дзякуючы рэгулярнай працы з вучэбнай і навуковай літаратурай мы з Генам ужо шмат што ведалі, калі можна так сказаць пра неабсяжны працэс пазнання, і выдзяляліся сярод іншых студэнтаў. Мае адзнакі пайшлі ўверх і я стаў амаль што выдатнікам, хаця чырвонага дыплома не атрымаў [9, с. 346].

На адным з семінарскіх заняткаў па навейшай гісторыі Германіі, калі мы разбіралі Баварскую савецкую рэспубліку 1919 г., Гена і я падрыхтавалі рэфераты на падставе спецыяльнай гістарычнай літаратуры, ад якіх праф. Трухноў аказаўся ў захапленні, назваўшы нас ці то выдатнымі студэнтамі ці то будучымі вучонымі, а нашы рэфераты ўзорнымі. Мы канечне пачарванелі ад гордасці. Як паказала жыццё, ён не памыліўся. У станаўленні Гены як вучонага, дапамозе яму ва ўладкаванні на працу ў Мінскі дзяржаўны педінстытут (будучы БДПУ імя М.Танка), устанаўленні кантактаў з аўтарытэтнымі маскоўскімі гісторыкамі-германістамі, вырашэнні іншых жыццёвых пытанняў праф. Трухноў адыграў важную ролю ў лёсе майго сябра. Праф. Трухноў дапамагаў і мне падчас навучання ў аспірантуры і абароны кандыдацкай дысертацыі ў спецсавеце БДУ ў сакавіку 1980 г. [9, с. 346].

Браты Г. і В.Космачы зрабілі значны ўклад у фарміраванне і развіццё беларускай школы германскіх даследаванняў. Падмурак гэтай школы быў закладзены у савецкія часы працамі У.Перцава, М.Палітыкі, Л.Шнеерсона, Р.Трухнова, Д.Клімоўскага, М.Елісеева і іншых беларускіх даследчыкаў. Г.Космач і яго брат В.Космач працягнулі традыцыі беларускай савецкай школы германістыкі, узняўшы яе на новы ўзровень ва ўмовах станаўлення незалежнай беларускай дзяржавы. Уклад Г.А.Космача ў гістарычную навуку і гістарычную адукацыю вымяраўся перш за ўсё падрыхтоўкай кадраў вышэйшай кваліфікацыі (дактароў і кандыдатаў навук) і публікацыяй вучэбных матэрыялаў (падручнікаў і дапаможнікаў) для сярэдняй і вышэйшай школы.

В. Космач узбагаціў беларускую гістарычную навуку двума дзесяткамі манаграфій па навейшай гісторыі Германіі, яе знешняй палітыкі, савецка-германскіх, у тым ліку беларуска-германскіх адносін, сучаснай гісторыі міжнародных адносін. Ён апублікаваў змястоўныя даследаванні і вучэбныя дапаможнікі па гісторыі дзяржавы і права Расіі і замежных краін, тэорыі і гісторыі культуры, краіназнаўству і краязнаўству. В.Космач стварыў у Віцебскім дзяржаўным універсітэце і вакол яго аўтарытэтны рэгіянальны цэнтр германскіх і міжнародных даследаванняў, вядомы сваімі аўтарамі, публікацыямі і традыцыйнай міжнароднай канферэнцыяй па гісторыі міжнародных адносін. Пад навуковым кіраўніцтвам прафесара В. Космача паспяхова абаранілі кандыдацкія дысертацыі восем яго аспірантаў. Дынастычную справу братоў Космачаў у вывучэнні і даследаванні беларускай і замежнай гісторыі працягваюць іх жонкі, сыны і дачкі. Сямейны ўклад Космачаў у развіццё беларускай гістарычнай навукі і адукацыі, які

запачаткаваў Генадзь Аркадзьевіч, а потым працягнуў Веніамін Аркадзьевіч, а за імі пашырае і ўзбагачае новае пакаленне, гэта прыкметная, неардынарная з’ява ў нашай навуцы і гістарычнай адукацыі.

**Крыніцы і літаратура**


1. Космач, В.А. Талуи: история деревни, ее жителей и окрестностей / В.А. Космач. – Витебск, ВГУ имени П.М. Машерова, 2022. – 344 с.
2. Слиж, М. Книгу о молодечненской деревне Марково планирует написать известный историк Вениамин Космач. 11.10.2022 // [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: Мінская праўда. file:///C:/Users/user/Desktop/тэксты%202023/космач/Книгу%20о%20молодечненской%20деревне%20Марково%20планирует%20написать%20известный%20историк%20Вениамин%20Космач%20-%20Минская%20правда.html – Дата доступу: 20.04.2023.
3. Слиж, М. Как молодечненский вяз, с которого три города видны, прославил деревню Талуи 14.07.2022 // [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: Мінская праўда. file:///C:/Users/user/Desktop/тэксты%202023/космач/Как%20молодечненский%20вяз,%20с%20которого%20три%20города%20видны,%20прославил%20деревню%20Талуи%20-%20Минская%20правда.html – Дата доступу: 20.04.2023.
4. Снапкоўская, С.В. Адукацыйная палітыка і школа на Беларусі ў канцы XIX – пачатку XX ст. / С.В. Снапкоўская. – Мінск: НІА, 1998. – 191 с.
5. Снапковская, С.В. Развитие образования и педагогической мысли Беларуси: вторая половина XIX – начало XX в. / С.В.Снапковская. – М.: УРАО ИТИП, 2011. –316 с.
6. Міхалюк, Д. Беларуская Народная Рэспубліка ў 1918–1920 гг.: Ля вытокаў беларускай дзяржаўнасці / Д. Міхалюк. – Смаленск: Інбелкульт, 2015. – 496 с.
7. Снапкоўская, С.В. Гісторыя адукацыі і педагагічнай думкі Беларусі (60-я гады XIX – пачатак XX ст.): вучэб. дапаможнік для студэнтаў / С.В. Снапкоўская. – Мінск: НІА, 2001. – 160 с.
8. Снапкоўскі, У.Е. Аб лектарскім майстэрстве Л.М. Шнеерсона / У.Е. Снапкоўскі // Актуальные проблемы истории Нового и Новейшего времени (к 100-летию профессора Л.М. Шнеерсона: междунар. науч.-теорет. конф. – Минск, РИВШ, 2012. –С. 24–28.
9. Снапкоўскі, У.Е. Аб студэнцкім сяброўстве з Генам Космачам / У.Е. Снапкоўскі // Историческая германистика: Актуальные проблемы современных исследований: сб. науч. статей и материалов / сост.: А.В.Косович, В.А.Космач, А.Ф.Великий, И.И.Ковяко. – Псков: ООО «Логос», 2018. – С. 344–348.
10. Снапкоўскі, У.Е. Даследаванні беларускіх вучоных па гісторыі нямецкага лібералізму XX ст. Рэц на кн.: Космач Г.А. Кризис германского либерализма в годы Веймарской республики: идеология и политика Немецкой демократической партии в 1918–1929 гг. – Мн., 1989; Елисеев М.Г. Между конфронтацией и разрядкой: СвДП в партийной системе ФРГ: проблемы «восточной» политики. – Мн., 1989 / У.Е. Снапкоўскі // Весці Акад. навук Беларускай ССР. Сер. грамад. навук. 1990. № 4. – С. 118–120.
11. Снапкоўскі, У.Е. Мае ўспаміны пра М.Г. Елісеева / У.Е. Снапкоўскі // Германия в системе международных отношений новейшего времени: ключевые аспекты современного осмысления: тезисы докладов круглого стола, посвящ. 70-летию крупного белорус. ученого-германиста Михаила Герасимовича Елисеева (1940–1997) (Минск, 18 янв. 2010 г.). – Брест: Альтернатива, 2010. – С. 9–11.
12. Улашчык М.М. Была такая вёска: Гісторыка-этнаграфічны нарыс / М.М. Улашчык. – Мінск: Полымя, 1989. – 134 с.
13. Улащик, Н.Н. Грамотность в дореволюционной Белоруссии / Н.Н. Улащик // История СССР. – 1968. – № 1. – С. 106–116.

# РАЗДЕЛ II
# ГЕРМАНИЯ И СТРАНЫ ЗАПАДА В НОВОЕ ВРЕМЯ

## ОСВОБОДИТЕЛЬНАЯ МИССИЯ КРАСНОЙ АРМИИ И ПЕРЕОСМЫСЛЕНИЕ РОЛИ СССР ВО ВТОРОЙ МИРОВОЙ ВОЙНЕ В СТРАНАХ ЦЕНТРАЛЬНОЙ И ЮГО-ВОСТОЧНОЙ ЕВРОПЫ

***М.С. Довгялло,*** *г. Минск (Республика Беларусь)*

Статья посвящена освободительной миссии Красной армии в странах Центральной и Юго-Восточной Европы (ЦЮВЕ). Автор рассматривает роль СССР и стран Антигитлеровской коалиции в освобождении Европы от гитлеровской Германии и ее сателлитов. Приводятся данные о потерях СССР в ходе наступательных операций в славянских странах, о разрушениях могил советских воинов и памятников освободителям.

**Ключевые слова:** Вторая мировая война, Великая Отечественная война, СССР, освободительная миссия, Красная армия, страны ЦЮВЕ, информационная война, борьба с памятниками, Польша, Чехословакия, Болгария, Югославия.

Прошло 78 лет после окончания Великой Отечественной войны. Сменилось несколько поколений людей, изменился и сам мир. Многое сегодня видится иначе, чем в далеком победном 1945-м. Тема освободительной миссии Красной армии во Второй мировой войне и переосмысление роли СССР не раз поднималась как в научной литературе, так и в средствах массовой информации. Сегодня она особенно актуальна, так как стала ареной информационной и идеологической войны против России. Решающий вклад в разгром фашистской Германии внес СССР, и этот факт очевиден и неоспорим с 1945 г., как главная, определяющая роль Красной армии в освобождении стран ЦЮВЕ. «…Именно русская армия выпустила кишки из германской военной машины…» [1, с. 299], в сентябре 1944 г. признал премьер-министр Великобритании У. Черчилль. В феврале 1945 г. он заявил: «Будущие поколения будут считать себя в долгу перед Красной армией столь же безоговорочно, как и мы, которым довелось быть свидетелем этих великолепных подвигов» [2, с. 280]. Всего Красная армия освободила почти 50% территории, полностью или частично 11 стран Европы с населением 113 млн. человек, а в освобождении еще 6 стран участвовала вместе с союзниками в 1944–1945 гг. [3, с. 103]. Для многих славянских народов Вторая мировая война стала самым трагическим событием за всю их